# ПАСТАЎСКІЯ ПЕРАЗВОНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5)*

якая, дарэчы, яшчэ не так даўно мела гучную назву Парыж. Выступіць у самім Доме культуры не атрымалася, бо нечакана знікла святло. Але артысты не разгубіліся і далі канцэрт на ганку. Цяжка было ім без мікрафонаў, цяжка было чытаць у поцемках ноты, але гралі выдатна. І людзі не разыходзіліся, слухалі — не зважаючы на паветраныя армады ненажэрных камароў. Салісткі нават баяліся спяваць — пруць проста ў рот. Асабліва спадабаліся вяскоўцам прыпеўкі. Гэта вельмі інфарматыўны жанр: праз іх у жартаўлівай абалонцы перадаецца, без тэлефонаў і карэспандэнтаў, жыццёвы вопыт ад вёскі вёсцы. Гэта амаль як ад сэрца сэрцу. Пасля канцэрта дырэктар мясцовай ПМК не без гумару папрасіў прабачэння за не надта светлую сустрэчу і запрасіў артыстаў за святочны стол.

Заключны дзень фестывалю пачаўся з ускладання кветак да помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны і тэатралізаванага дзейства, прысвечанага памяці артыстаў франтавых брыгад і партызанскіх атрадаў. Затым удзельнікі фестывалю і шматлікія гледачы пешшу накіраваліся, спяваючы на хаду, у гарадскі парк, дзе адбыўся гала-канцэрт "Пастаўскія перазвоны". Побач з амфітэатрам па традыцыі запрашаў гасцей "Горад Майстроў". Тут можна было ўбачыць, як працуюць народныя ўмельцы — ткачыхі і ганчары, набыць мастацкія вырабы з саломкі і карункаў, творы самадзейных мастакоў. Увесь парк аздаблялі плакаты з тэкстамі накшталт:"Грай або скрыпку аддай", "Дай кішцы волю — праясі і шчасце, і долю", "Музыканцік, весялей, маіх ножак не жалей!".

Многія калектывы, што ўдзельнічалі ў заключным канцэрце, усё ж такі цяжка назваць адметнымі. Добра, што выступалі ў розных касцюмах, а з закрытымі вачыма можна было б і не заўважыць адрознасці. Ёсць у мяне прэтэнзіі і да рэпертуару. Не сакрэт, што многія гурты народнай музыкі выязджаюць на гастролі за мяжу (гэта вельмі падтрымлівае наш музычны фальклор, прываблівае ў гурты моладзь). Наш фальклор сапраўды канкурэнтаздольны ў свеце. Але рэч у тым, што гэта ўплывае на выбар рэпертуару, бо на замежных канцэртах і на розных кшталту "прэзентацыях" беларускіх фірм, куды сталася модным запрашаць народныя аркестры, асаблівым поспехам карыстаюцца танцавальныя і застольныя песні. А фальклор жа значна шырэйшая з'ява: на фестывалі павінны былі б гучаць і абрадавыя песні — жалобныя, калядныя і г.д. Магчыма, яны не такія эфектныя і простыя для ўспрымання, але ж...

У фальклорным мастацтве існуе прыкладна такі ж падзел, які можна знайсці паміж рокам і папсой: ёсць музыка "для ног" і ёсць музыка "для галавы". На фестываль быў запрошаны, але чамусьці не прыехаў гурт "Ліцьвіны", які выконвае "інтэлектуальны" фальклор. Большасць жа ўдзельнікаў іграла менавіта "эстрадны" варыянт народнай музыкі. Дарэчы, паказальнікам таго, для ног ці для галавы іграе гурт, можа служыць тое, на якой мове размаўляюць па-за сцэнай артысты: прыхільнікі аўтэнтычнай музыкі размаўляюць паміж сабой на беларускай мове.

Мушу сказаць, што найбольш штучна, ненатуральна выглядалі на фестывалі расіяне — ансамбль рускіх народных інструментаў г.Людзінава Калужскай вобласці. Такое ўражанне, што выступаў пераапрануты камерны аркестр, а саліст нібыта шмат гадоў працаваў у аперэце. Музыка перапрацаваная настолькі, што не засталося нічога вясковага. Мне ўвогуле здаецца, што рускія заакадэмізавалі свой фальклор ці заэстрадзілі. Беларускія гурты непараўнальна бліжэйшыя да аўтэнтыкі, але ёсць праблема: спяваем на адной мове, размаўляем на іншай.

Не дзіва, што на гэтым фоне найбольш натуральна выглядалі ўкраінцы — фальклорныя ансамблі Івана-Франкоўскай вобласці. Калі б конкурс не быў рэспубліканскім, ім абавязкова прысудзілі б Першую прэмію, настолькі спадабаліся яны гледачам і членам журы. Гурт выступаў надзвычай артыстычна — асабліва саліст: неверагодных памераў дзядзька, падобны да Тараса Бульбы (ён атрымаў прыз глядацкіх сімпатый, а ўвесь гурт — званне лаўрэата).

Сярод нашых калектываў званне лаўрэата фестывалю заваявалі народны ансамбль "Явар" з Мазыра, ансамбль народнай музыкі з г.Заслаўя, народны ансамбль "Музыкі" з Гродна (гэты калектыў варты павагі за тое, што скарыстоўвае шмат рэдкіх, асабліва духавых народных інструментаў). Першае месца журы вырашыла падзяліць паміж мінскім фальклорным гуртом "Шчодрыца" і пастаўскім ансамблем "Паазер'е". Гурту "Шчодрыца" быў прысуджаны і галоўны прыз — дыятанічныя цымбалы, зробленыя майстрам Іванам Андронам спецыяльна да фестывалю. Лаўрэатамі конкурсу гарманістаў і прыпевачнікаў "Хто каго?" сталіся мінчанін Міхал Слізкі і магілёвец Леанід Мазнеў. Гэтыя гурты і салісты выглядалі найбольш аўтэнтычна, бо ігралі музыку пераважна свайго рэгіёна, і ігралі віртуозна. Старшыня журы, рэктар Беларускай акадэміі музыкі Міхаіл Казінец нават выйшаў на сцэну і расцалаваў мастацкіх кіраўнікоў лепшых ансамблей.

Ганаровы госць фестывалю, выдатны калектыў з Іванава "Палешукі", які ў мінулым годзе заняў першае месца, сёлета будзе прадстаўляць краіну на міжнародным фестывалі фальклору ў Стражніцы (Чэхія). Сёлетнія пераможцы — гурты"Шчодрыца" і "Паазер'е" таксама будуць накіраваныя міністэрствам на прэстыжныя фестывалі ў Заходняй Еўропе.

Перад удзельнікамі і гледачамі гала-канцэрта выступіў міністр культуры і друку Анатоль Бутэвіч. Ён упэўнены, што нашаму мастацтву ёсць чым ганарыцца. І асабліва прыемна бачыць сярод удзельнікаў шмат моладзі, якая працягне далёка ў будучыню слаўныя традыцыі беларускай народнай музыкі. Песня, паводле міністра, — гэта душа народа. Народ заўсёды жыў з песняй. Народ, які не спявае, не здолее палепшыць жыццё сваёй краіны. Вядома, што не бывае песні без хлеба, але і хлеба без песні не будзе.

Што ж, будзем спадзявацца, што беларускі народ не пакіне спяваць і любіць музыку. У нас пакуль — адна з найбольш "музычных" краінаў у свеце: яшчэ не так даўно выконвалася дырэктыва партыі ахапіць 25 працэнтаў дзяцей музычнай адукацыяй. Сёння ж у Віцебскай вобласці, напрыклад, музыкай займаюцца толькі 7 працэнтаў, і не вядома, колькі талентаў краіна не далічыцца ў бліжэйшы час...

**Юрась БАРЫСЕВІЧ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ